# МАСКА, ПАЛЬЧАТКІ І ДЫСТАНЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Інакш ставяцца да бяспекі сваіх наведвальнікаў іх калегі іншай сеткі рэстаранаў. Там загараджальнай стужкай зачынілі столікі так, што наведвальнікі проста вымушаны выконваць дыстанцыю не ў 1,5 метра, а ў цэлыя 2-3 метры. Наведвальнікаў з-за гэтага, здаецца, зусім няшмат. На заўважным месцы вісіць дазатар з антысептыкам. Работнікі ў масках і пальчатках. На зале стаіць чалавек, які амаль пасля кожнага, хто ўваходзіць у рэстаран, працірае дзвярныя ручкі. Пасля таго як наведвальнік сыходзіць, літаральна адразу столік апрацоўваюць. Нягледзячы на тое што я была там прыкладна ў той жа час вечара, што і ў першым кафэ, здавалася, нават паветра тут больш свежае. Але я думаю, што справа ўсё-такі ў тым, што ў гэтай сетцы рэстаранаў прынята часцей чысціць кандыцыянеры.



У правілах, рэкамендаваных уладамі, адзначаецца, што неабходна «забяспечыць выкарыстанне работнікамі аб'ектаў, якія маюць непасрэдны кантакт з наведвальнікамі, сродкаў абароны органаў дыхання (маскі), пальчатак, антысептыкаў для рук». Заходжу ў найбліжэйшы да дома папулярны гандлёвы цэнтр па прадукты і тут жа трапляю на жанчыну каля ўвахода, якая апрацоўвае ручкі кошыкаў нейкім сродкам. На заўважным месцы вісіць дазатар з антысептыкам і там жа побач на стойцы — сурвэткі. Жанчына, якая скарысталася дызсродкам, незадаволена і запэўнівае мяне, што ў ім проста вада, аргументуючы адсутнасцю паху. Рашаюся наліць на свае далоні антысептык і паднесці да носа. І сапраўды, без паху! Бяру тут жа сурвэтку і выціраю рукі. Для спакою дастаю з сумкі свой, які мае спецыфічны «водар». У хлебным аддзеле кухары ў масках і пальчатках выкладваюць упакаваную выпечку на стэлажы. Каля касы вісяць напамінкі аб захаванні дыстанцыі. Магчыма, з-за таго, што аб'ява на ўзроўні вачэй, людзі трымалі дыстанцыю ў 1,5 метра больш ахвотна, праўда, з-за гэтага чарга расцягнулася на шмат метраў. А вось у іншым гандлёвым пункце, не менш папулярным у Мінску, дыстанцыю ніхто не трымаў, хоць людзей было поўна. Здавалася, быццам увесь раён разам вырашыў наведаць краму і пры гэтым пляваў на ўсе меры засцярогі. Але ж я там не сустрэла ні аднаго работніка без маскі. Праўда, некаторыя супрацоўнікі сцягвалі маску так, каб нос быў адкрыты... З уласнага досведу ведаю, як цяжка дыхаць пад маскай некалькі гадзін запар у памяшканні. Яшчэ мяне ўразіла, што ўсе касіры крамы былі забяспечаны пластыкавымі шчыткамі, якія закрывалі твар работніка. Гэтая маска не герметычная, але цалкам абараняе супрацоўнікаў ад пырскаў пры чханні пакупніка, які не патурбаваўся прыкрыць рот. Дзяўчына, якая абслугоўвала мяне на касе, была ў пальчатках.

У крамах нехарчовых тавараў людзей было менш, але, напрыклад, у адным з буйных універмагаў Мінска я ўбачыла толькі адну жанчыну-касіра ў пальчатках і з маскай на твары. Астатнія як быццам бы згаварыліся пры мне сцягнуць маскі на падбародак, а ў некаторых аддзелах супрацоўнікі ўнівермага наогул былі без іх. Пальчатак на прадаўцах я таксама не ўбачыла. Але крама адкрываецца не ў дзевяць раніцы, як раней, а ў дзесяць. Відаць, гэтую гадзіну там выкарыстоўваюць на апрацоўку не толькі самога памяшкання, але і магазіна звонку. Да такой высновы я прыйшла, калі ўбачыла, што асфальт каля вонкавых вітрын і лесвіцы па раніцах пакрыты белым налётам. А вось у адным з сэканд-хэндаў мяне чакаў прыемны сюрпрыз. Пакупнікі выконвалі дыстанцыю, а касір была ў масцы і пальчатках, да таго ж перыядычна апрацоўвала чымсьці паверхню стала з касай, за якім стаяла.

У правілах, рэкамендаваных Мінгарвыканкамам, ёсць пункт, які прадугледжвае выбарчы кантроль за санітарным утрыманнем грамадскага транспарту. Праўда, гэтая мера часам палохае пасажыраў, якія любяць паспаць у транспарце. Аляксандр, кіроўца аўтобуса аўтапарка № 6, расказаў, як смяяўся, калі зайшоў на дыспетчарскай станцыі ў салон з работнікамі парка, якія апрацоўваюць аўтобусы дэзсродкамі кожныя 3-4 гадзіны.

«Яны ж у ахоўных касцюмах і з распыляльным апаратам, — расказвае кіроўца. — Я буджу «соню», а ён, расплюшчыўшы вочы, як падскочыць! Небарака амаль бег ад аўтобуса!»

Сам кіроўца прызнаўся, што ў парку амаль усе яго калегі старанна выконваюць правілы асабістай гігіены. Нягледзячы на тое што ў кіроўцаў асобная кабіна, многія носяць маскі і выкарыстоўваюць пальчаткі. Гэта звязана з тым, што ім даводзіцца прадаваць талончыкі пасажырам. У маршрутках кіроўцы таксама выкарыстоўваюць антысептыкі для рук, і многія вядуць аўтамабіль у масцы, але пальчаткі носяць не ўсе.

— На самай справе вельмі важна выконваць гэтыя рэкамендацыі, — гаворыць **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Ніна ЕМЯЛЬЯНАВА.** — Мы прапанавалі адмяніць у Мінску правядзенне кірмашоў, прэзентацый і выстаў. Раім прыбіраць жылыя шматкватэрныя дамы з выкарыстаннем дэзынфіцыруючых сродкаў і натуральна. Работнікам сферы абслугоўвання трэба не толькі быць забяспечанымі маскамі, але і ўмець іх правільна насіць. Недапушчальна прадаўцу апускаць маску на падбародак або не закрываць нос. Гэта проста ілюзія стрымлівання распаўсюджвання інфекцыі, і плёну не дае. Важна сур'ёзна ставіцца да рэкамендаваных правілаў. Але нашы пакупнікі часам да сваёй бяспекі ставяцца бездакорна. Нават калі крама будзе рабіць кожныя пяць хвілін аб'явы пра тое, што трэба захоўваць дыстанцыю, на кожнай касе вывесяць аб'явы і нанясуць на падлогу разметку «Трымай дыстанцыю», людзі ўсё роўна «не чуюць» і «не бачаць». Сёння ў кожнага беларуса ёсць магчымасць стаць крыху лепшым! Для гэтага трэба проста выконваць правілы, якія дапамогуць нам папярэдзіць распаўсюджванне інфекцыі і тым самым зберагчы людзей, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

---

Фінансы

# МІКРАКРЭДЫТЫ ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

**У нашай краіне 27 красавіка ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта № 394 «Аб прадастаўленні і прыцягненні пазык», прыняты для ўпарадкавання дзейнасці па рэгулярным прадастаўленні і прыцягненні пазык і ўзмацнення абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. Пракаментаваў нормы гэтага дакумента падчас анлайн-брыфінгу начальнік Галоўнага ўпраўлення рэгулявання некрэдытных фінансавых арганізацый Нацыянальнага банка краіны Дзмітрый НАБЗДОРАЎ.**

## Да гэтай просьбы лепш прыслухацца

Дзмітрый Набздораў папрасіў ад імя Нацыянальнага банка кіраўніцтва мікрафінансавых арганізацый па магчымасці знізіць стаўкі і даць адтэрміноўкі плацяжоў тым кліентам, якія цяпер аказаліся ў складаных фінансавых умовах. Дадзеныя рэкамендацыі накіраваны і ў Асацыяцыю мікрафінансавых арганізацый, і ў Асацыяцыю лізінгадаўцаў, каб фінансавыя інстытуты ўважліва ставіліся да ўзніклай сітуацыі і пры наяўнасці дакументальна пацверджанага ад спажыўца фінансавай паслугі факту зніжэння альбо страты даходу ішлі насустрач у плане зніжэння працэнтных ставак, адтэрміноўкі, непрымянення пені, штрафу і няўстойкі.

Нацбанк абяцае маніторыць сітуацыю разам з Асацыяцыяй мікрафінансавых арганізацый. «Мы вельмі ўважліва будзем адсочваць, як на кожны зварот грамадзяніна зрэагавала тая ці іншая юрыдычная асоба. Гэтая інфармацыя будзе ўлічвацца пры planаванні праверак на наступнае паўгоддзе», — адзначыў прадстаўнік Нацбанка.

## Больш не загоняць у непад'ёмныя даўгі

Цяпер сума працэнтаў за ўвесь тэрмін карыстання мікрапазыкай не можа перавышаць двухразовай сумы пазыкі, а сума няўстойкі (штрафу, пеняў) не можа быць вышэйшай за палову сумы доўгу. Гэта значыць, калі вы ўзялі ў такой арганізацыі 200 рублёў, то сума працэнтаў не можа перавышаць 400 рублёў, штрафу за пратэрміноўку — 100 рублёў.

Не дапускаецца ўключэнне ў дагавор умоў аб спагнанні з пазычальніка павышаных працэнтаў за карыстанне мікрапазык у выпадку невыканання або неналежнага выканання абавязацельстваў па дамове. Як растлумачыў Дзмітрый Набздораў, захаваецца магчымасць датэрмінова пагасіць пазыку, а таксама ўстаноўка верхняга падзелу ставак па іх.

Прадстаўнік Нацбанка падкрэсліў, што дзеянне дакумента распаўсюджваецца і на новыя, і на раней заключаныя дагаворы. Арганізацыям даецца два месяцы на прывядзенне старых дагавораў у адпаведнасць з прынятымі дакументамі.

Паводле звестак Нацбанка, летась аб'ём выдадзеных мікрапазык вырас на 20 % да 2018 года — да 131 млн рублёў. Колькасць пазычальнікаў павялічылася на 8 %. Сярэдняя сума пазык складала 115 рублёў.

## Ламбарды па новых правілах

Таксама гэтым дакументам зменены падыходы да фарміравання статутнага фонду ламбарда. Цяпер ён павінен быць сфарміраваны шляхам унясення грашовых сродкаў у памеры не менш чым мінімальны памер статутнага фонду, устаноўленага Нацбанкам. Чакаецца, што гэта дазволіць палепшыць фінансавае становішча ламбардаў і павысіць узровень адказнасці іх заснавальнікаў.

Пры гэтым пашыраны пералік відаў дзейнасці, дазволеных ламбардам. Яны могуць прадастаўляць мікрапазыкі грамадзянам пад заклад транспартных сродкаў без абавязку перадачы прадмета закладу ў ламбард, ажыццяўляць камісійны гандаль, захоўванне рэчаў і іх набыццё для рэалізацыі.

Пры ўзнікненні канфліктнай сітуацыі паміж пазычальнікам і пазыкадаўцам да звароту ў суд або Нацбанк абавязковым будзе прад'яўленне бакамі спрэчкі прэтэнзіі — пісьмовай прапановы аб добраахвотным рэгуляванні ўзніклай спрэчкі.

## Рэклама і золата

Таксама ўказам устаноўлены патрабаванні да рэкламы як да дзейнасці па прыцягненні пазык. Яна павінна будзе змяшчаць поўную і дакладную інфармацыю аб рэкламадаўцах і рэкламаванай імі дзейнасці. Гэта патрабаванне распаўсюджваецца як на арганізацыі, уключаныя ў рэестр мікрафінансавых арганізацый, так і на любыя суб'екты, якія прадастаўляюць грашовыя сродкі ў пазыку.

У адпаведнасці з новаўвядзеннямі, членамі спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі (для атрымання фінансавання сваёй дзейнасці) змогуць стаць фізічныя асобы, якія вырабляюць сельгаспрадукцыю, ажыццяўляюць віды дзейнасці, калі выплачваецца адзіны падатак, а таксама суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

Пасля ўступлення ў сілу змяненняў прадастаўляць пазыкі пад заклад рухомай маёмасці змогуць таксама дзяржаўныя юрыдычныя асобы, якія аказваюць бытавыя паслугі і зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці, а таксама тыя асобы, якія ажыццяўляюць скупку каштоўных металаў і камянёў для папаўнення Дзяржфонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

Акрамя таго, для выключэння асобных надобрасумленных практык прадастаўлення грашовых сродкаў абмяжоўваецца спектр рэчаў, якія могуць быць прадметам лізінгу па дагаворах зваротнага лізінгу, якія заключаюцца з фізічнымі асобамі. Цяпер, пачынаючы з 27 красавіка, імі могуць выступаць толькі транспартныя сродкі і жылыя памяшканні. Раней нараканні выклікалі здзелкі па прадастаўленні грамадзянам грашовых сродкаў пад высокія працэнты, якія афармляюцца ў выглядзе зваротнага лізінгу мабільных тэлефонаў і камп'ютарнай тэхнікі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Навука

# ДАСЬЕ НА БАЛОТА

**Вучоныя Беларусі сабралі багаты матэрыял пра адзін з унікальных аб'ектаў запаведнага фонда краіны — балота Дзікае, якое знаходзіцца на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Белавежская пушча». Гэта трэцяе па памерах балота ў Беларусі і адзін з найважнейшых прыродных аб'ектаў у свеце. Тут гняздуецца 140 відаў птушак, 39 працэнтаў з якіх маюць міжнародны ці нацыянальны стасус аховы.**

На працягу шматгадовых палявых даследаванняў балотнага масіва і прылягаючых тэрыторый вучоныя збіралі звесткі пра клімат, рэльеф, гідралогію і гідраграфію, стратыграфію тарфяных залежаў, ландшафты асабліва ахоўнай тэрыторыі. Апісаны флора і фаўна, складзены спісы рэдкіх і ахоўных раслін і жывёл. Да таго ж прааналізаваны рэкрэацыйны і сацыяльна-эканамічны патэнцыял раёна, звесткі пра гісторыка-культурную спадчыну.

Усю гэту інфармацыю можна знайсці ў выданні «Балота Дзікае», падрыхтаваным калектывам аўтараў пад агульнай рэдакцыяй намесніка дырэктара Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі Дзмітрыя Грумо. Гэтае выданне распачынае серыю пра водна-балотныя ўгоддзі міжнароднага значэння на тэрыторыі Беларусі, якія ахоўваюцца ў адпаведнасці з Рамсарскай канвенцыяй.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**